УДК 94(476)

**Л. Ю. Малыхіна** (г. Брэст, Беларусь)

# ВЫРАШЭННЕ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПЫТАННЯ ВА ЎМОВАХ ЗАВЯРШЭННЯ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

У артыкуле першая спроба абвяшчэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці даследуецца ў кантэксце ўсходнееўрапейскай геапалітычнай сітуацыі другой паловы 1917–1918 гадоў. Робіцца выснова, што Савецкая Расія, якая падпісала Брэсцкі мір на цяжкіх для сябе ўмовах, да канца Першай сусветнай вайны вымушана была ігнараваць першыя крокі па самастойнай рэалізацыі беларусамі права на самавызначэнне.

Ключавыя словы: Першы Усебеларускі з’езд, Брэст-Літоўскі мірны дагавор, Беларуская Народная Рэспубліка.

Рэвалюцыйныя падзеі ў Расіі станоўчым чынам паўплывалі на далейшае развіццё нацыянальна-вызваленчага руху беларусаў. Калі ў кастрычніку–лістападзе 1917 г. стратэгічная ініцыятыва ў развіцці міжнароднай дыпламатыі перайшла да савецкага ўраду, у беларускага народа ўпершыню ў гісторыі з’явіўся рэальны шанец на ўтварэнне нацыянальнай дзяржаўнасці. Метады стварэння, форма і палітычная накіраванасць будучай рэспублікі вельмі моцна залежалі і ад геапалітычнай сітуацыі, якая склалася ў завяршальны перыяд Першай сусветнай вайны, і ад падтрымкі суседніх уплывовых дзяржаў.

У практыцы міжнародных адносін за мінулае XX стагоддзе склаліся два шляхі прызнання новых краін: *канстытутыўная і дэкларатыўная.* Прыхільнікі новага, дэкларатыўнага механізма ўтварэння новай формы дзяржаўнасці сцвярджалі, што палітыка-прававыя і тэрытарыяльна-пра-

вавыя змяненні ўнутры дзяржавы – гэта ўнутраная справа саміх краін. Юрыдычны грунт у выглядзе "Дэкларацыі праvoў народаў Расіі"[3] ад 2(15) лістапада 1917 г., які садзейнічаў станоўчаму вырашэнню нацыянальнага пытання сярод народаў Расіі, дазволіў распачаць і падрыхтоўку Першага Усебеларускага з'езда (14–18 снежня 1917 г.), удзельнікам якога было прапанавана сфармуляваць канкрэтны вобраз палітычнага будучага беларускага народа.

Немалаважна адзначыць той факт, што ў час падрыхтоўчай работы да з'езду заходняя частка беларускага краю з гарадамі Брэст-Літоўск, Гродна, Пінск, Ліда і іншымі ўваходзіла ў зону германскай акупацыі, а яе ўсходняя частка знаходзілася ў зоне Заходняга фронту і новаўтворанай у сакавіку 1917 г. адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Расіі – Заходняй вобласці.

Часовыя органы ўлады на Беларусі – Беларускі абласны камітэт (БАК) пры Усерасійскім Савеце Сялянскіх дэпутатаў, Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту як выканаўчы орган Абласнога выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах) – падпарадкоўваліся цэнтральнаму кіраўніцтву РСФСР. Гэта ў нейкай ступені тлумачыла разыходжанні ў тагачасных палітычных сіл у вызначэнні ідэалагічных прыярытэтаў пры вырашэнні беларускага пытання. Для ленінскага ўрада Савецкай Расіі перш за ўсё неабходна было вывесці краіну з ваеннага становішча, рэалізаваць дактрыну

3. Са спасылкамі на гэты дакумент 20 лістапада 1917 г. была прадэкларавана Украінская Народная Рэспубліка (УНР), Цэнтральная Рада якой, як фактычна незалежны ад Расіі ўрад, была ўтворана яшчэ ў сакавіку 1917 г. і прызнана Часовым урадам А. Керанскага, а пазней – Германіяй і Аўстра-Венгрыяй. Палітычную сітуацыю ўскладніла тое, што 30 снежня 1917 г. у г. Харкаве стварылі ўрад Украінскай Народнай Рэспублікі Саветаў, а Цэнтральная Рада УНР была скасавана. 22 студзеня 1918 г. УНР з падтрымкай Германіі, зноў абвясціла сваю незалежнасць ад Савецкай Расіі, што і было адлюстравана ў Берасцейскім мірным дагаворы ад 9 лютага 1918 г.

“мір без анэксій і кантрыбуцый”, захаваць тэрытарыяльную цэласнасць у рамках былой імперыі, таму БАК, члены БСГ и эсэры выступалі за аўтаномію беларусаў. СНК РСФСР вылучыў на правядзенне з’езда 50 тыс. рублёў.

Вялікая Беларуская Рада, якая гуртавала вакол сябе нацыянальныя сілы, галоўнай сваёй задачай бачыла стварэнне незалежнай беларускай дзяржаўнасці. У якасці дэлегатаў беларускага з’езду ў Мінске значыліся прадстаўнікі розных палітычных і грамадскіх аб’яднанняў.

Мінскія пасяджэнні Усебеларускага з’езда адбываліся напярэдадні мірных перагавораў ў Брэст-Літоўску, што сведчыла аб жаданні ажыццявіць дэкларацыю новай дзяржавы з мэтаю далейшага прызнання яе інтарэсаў прадстаўнікамі міжнароданай супольнасці на перамовах. Аднак поспех у гэтай справе залежаў ад таго, ці стане ўвогулле хто-небудзь з беларускіх палітычных дзеячаў прысутнічаць, а тым больш уплываць на ход дыскусіі аб узаемных тэрытарыяльных прэтэнзіях галоўных фігурантаў мірнай канферэнцыі. На той момант захаванне тэрытарыяльнага адзінства ў межах этнічнага рассялення беларусаў залежала толькі ад расійскага і германскага ўрадаў.

Усебеларускі з’езд, які ўзяў на сябе функцыю падрыхтоўкі будучага ўстаноўчага сходу для абвяшчэння новай рэспублікі прадстаўнікамі розных палітычных сіл і дзеючай мясцовай улады Заходняй вобласці, даваў у перспектыве магчымасць стварэння легітымнага кааліцыйнага урада. Уражвае колькасць яго удзельнікаў – 1872 чалавек, 1167 з іх мелі права рашаючага голасу. Дэлегатамі было прапанавана: стварыць рэспубліку парламентскага тыпу, у якой вышэйшым заканадаўчым органам стане Народны сход, а выканаўчай уладай – Савет старэйшын з 10 чалавек; а для абвяшчэння дзяржавы падрыхтаваць Вялікі беларускі ўстаноўчы сход. З’езд прыняў рашэнне аб стварэнні органа кра-

ёвай улады ў выглядзе *Усебеларускага Савета сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў* (хаця падобны орган – Аблвыкамзах – ужо існаваў у Беларусі).

Але "гара нарадзіла мыш". У ноч з 17 на 18 снежня, калі завершылася чытанне праекта рэзалюцыі "Аснова рэспубліканскага ладу Беларусі ў складзе Агульнарускай федэрацыі", удзельнікі з'ёзду былі разагнаны саладатамі гарнізона С. Крывашэіна ад імя Саўнаркама Заходняй вобласці і фронту. Арышт 27 чалавек (куды сярод іншых увайшлі будучыя старшыні савецкага ўрада Беларусі А.Р. Чарвякоў і Д.Ф. Жылуновіч! [1, с.173]) не перашкодзіў астатнім членам Выканкама Рады з'езда на чале з Т. Грыбом нелегальна прадоўжыць падрыхтоўчую работу да стварэння рэспублікі. З гэтага моманту нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва на Беларусі стала ажыцяўляцца ў розных накірунках – нацыянальна-дэмакратычным і савецкім. У свеце дадзеных сучаснай навукі ацэнка Першага Усебеларускага з'езда як конррэвалюцыйнага, і антысавецкага, як гэта рабілася ў савецкай гістарыяграфіі, не мае пад сабою падставы.

Між тым цяжкае ваенна-палітычнае становішча на канцы 1917 г., закладнікам якога апынуўся беларускі край, вымусіла абодва ваюючыя на Усходнім фронце бакі – Цэнтральныя дзяржавы і Расійскую Савецкую рэспубліку – сесці за стол перамоў. 22 снежня 1917 г. у Брэст-Літоўску пачала работу мірная канферэнцыя, і ўжо 28 снежня старшыня германскай дэлегацыі Рыхард фон Кюльман уручыў савецкаму боку аўстра-германскія ўмовы міру, па якіх ад Расіі адрываліся б Польша, Літва, Курляндыя, частка Эстоніі і Ліфляндыі, якія пераходзілі пад пратэктарат Германіі. Падпісанне мірнага дагавора на гэтай стадыі савецкая дэлегацыя палічыла немэтазгодным і прадоўжыла абмеркаванне ўмоў. 18 студзеня 1918 г. пачалося новае наступленне аўстра-германскіх войскаў на усход, ад прадстаўнікоў Германіі ўпер-

шыню прагучала патрабаванне аддзяліць ад РСФСР яшчэ і значную частку Беларусі. Ад Расіі ў такім выпадку адыходзілі тэрыторыі агульнай плошчай больш 150 тыс. кв. км.

У ходзе ўнутрыпалітычнай дыскусіі сярод бальшэвікоў і эсэраў 21 студзеня прапанова У. І. Леніна заключыць мір на гэтых умовах не была падтрымана пры галасаванні пяць разоў. Большасць схілялася да пазіцыі наркама замежных спраў РСФСР Л. Д. Троцкага, які патрабаваў спыніць ваенныя дзеянні без падпісання анексійнага міру з Германіяй і яе саюзнікамі. Гэтая пазіцыя была агучана на перамовах 10 лютага, а 16 лютага Германія заявіла аб узнаўленні ваенных дзеянняў.

Новы германскі ўльтыматум патрабаваў ад Расіі, акрамя пералічаных раней тэрыторый, не толькі аддаць поўнасцю Эстляндыю, Ліфляндыю, яшчэ большую частку Беларусі, але і вываду Чырвонай Арміі з Украіны і Фінляндыі. Усяго краіна Саветаў магла страціць ужо каля 1 млн. кв. км. Актуальнае для народаў усіх пералічаных тэрыторый пытанне аб нацыянальным самавызначэнні ўвайшло ў набор галоўных палітычных аргументаў, якія павінны былі абгрунтаваць пратэктарат Германіі на заваяваных тэрыторыях[4].

Менавіта ў гэты час, пасля зрыву перамоваў у Брэсце, Выканкам Усебеларускага з'езда ў свабодным яшчэ Мінску прыняў першую "Устаўную грамату да народаў Беларусі" ад 21 лютага 1918 г. аб стварэнні першага ўрада – Нацыянальнага Сакратарыята. 24 лютага савецкі бок згадзіўся

4. Па існаваўшым на той час міжнародным традыцыям вядучыя краіны свету маглі прызнаць і канстытуяваць новыя краіны. Так, Германія падтрымала незалежнасць Украіны. Падпісанне 27 студзеня (9 лютага па новаму стылю) 1918 г. у Брэст-Літоўске мірнага пагаднення паміж Украінскай Народнай Рэспублікай, з аднаго боку, і Балгарскім царствам, Германскай, Аўстра-Венгерскай, Асманскай імперыямі, з другога боку, де-юрэ азначала прызнанне УНР у якасці паўнавартаснага суб'екта міжнародных зносін. 7 сакавіка 1918 г. германскі ўрад падпісаў пагадненне з законным урадам Фінляндыі, а 23 сакавіка прызнаў незалежнасць Літвы. І гэтыя падзеі давалі падставу беларускім дзеячам таксама чакаць падтрымкі ў справе нацыянальнага будаўніцтва.

на германскія ўмовы міру. 28 лютага беларуская дэлегацыя наведала рэзідэнцыю германскай адміністрацыі ў Мінску і выказала лаяльнасць да акупацыйных улад. Але рэакцыя на прапанову прызнання Нацыянальнага Сакратарыята была адмоўнай, паколькі германскі ўрад лічыў Беларусь "часткай Расіі і па Берасцейскаму ўгавору без ураду Леніна гэта пытанне вырашыць не мог" [4, с. 35].

У адпаведнасці з III артыкулам Брэст-Літоўскага мірнага дагавора, падпісанага 3 сакавіка 1918 г. паміж Савецкай Расіяй, з аднаго боку, і Германіяй, Аўстра-Венгрыяй, Балгарыяй і Турцыяй, з другога – "Области, лежащие к западу от установленной договаривающимися сторонами линии и принадлежавшие России, не будут больше находится под её верховной властью, установленная линия обозначена на приложенной карте". Як не без падстаў спадзявалася савецкае кіраўніцтва цяжкія ўмовы міру мелі часовы характар, а Германію чакала хуткае паражэнне ў вайне.

Этнічная тэрыторыя Беларусі згодна з прыгаданай картай была падзелена па лініі Дзвінск – Свянцяны – Ліда – Ружаны – Брэст-Літоўск. Гродзеншчына і Віленшчына адыходзілі да Літвы, якая знаходзілася пад пратэктаратам Германіі з 11 снежня 1917 г., калі Літоўская Тарыба абвясціла дэкларацыю аб аднаўленні дзяржавы ў саюзе з ёю. Міншчына, а таксама частка Віцебскай і Магілёўскай губерняў з'яўляліся часова акупаванымі кайзераўскімі вайскамі. Брэстчына з гарадамі Брэст, Кобрын, Пружаны, Драгічын, Лунінец, Пінск і Столін, а таксама Гомельшчына з Гомелем, Рэчыцай і Мазыром адыходзілі да Украіны. Усходнія раёны Беларусі заставаліся ў складзе РСФСР.

Ва ўмовах, калі Беларусь фактычна ўвайшла ў склад чатырох краін, 9 сакавіка 1918 г. Выканкам рады Усебеларускага з'езда абвясціў Беларускую Народнаю Рэспубліку канстытуцыйным дэмакратычным уладкаваннем, а 25 са-

кавіка зацвердзіў яе суверэнітэт ў рамках этнічнай тэрыторыі. Заканадаўчая ўлада знаходзілася ў руках Рады Усебеларускага з'езда, якая з 18 сакавіка была пераўтворана ў Раду БНР з 71 чалавека (туды ўвайшлі В. Ластоўскі, А. Луцкевіч, К. Езавітаў, Т. Серада, Т. Грыб, П. Крэчэўскі, Я. Лёсік, І. Варонка і інш.).

29 сакавіка 1918 г. на пасяджэнні Рады БНР была створана камісія міжнародных спраў, якая стала працаваць над апісаннем граніц. Новая рэспубліка не мела арміі, органаў мясцовай улады, не былі яшчэ канкрэтна вызначаны яе межы. Германія адмовілася прызнаць яе і разглядала як складовую частку Расіі. Тым не менш Рада БНР памылкова спрабавала рэалізаваць ідэю дзяржаўнасці менавіта пры патрымцы германскіх акупацыйных улад. Гэта, вядома, пагоршыла яе стасункі з РСФСР. У артыкуле "Жребий брошен!" ад 8 красавіка 1918 г. выдатны беларускі дзеяч, прафесар гісторыі М.В. Доўнар-Запольскі прызнаваўся: "Мы не спешили отложиться от нашей восточной сестры, но Петербургские правители ограбили нашу бедную страну, не дали в ней сложиться правлению на федеративных или автономных началах и бросили нашу родину на произвол судьбы" [1, с. 2–3]. Доўнар-Запольскі ў маі–кастрычніку 1918 г. у складзе дыпламатычнай місіі БНР у Кіеве вёў перагаворы з прадстаўнікамі РСФСР, Украіны, Дона, Германіі, Аўстра-Венгрыі аб прызнанні Беларусі суб'ектам міжнароднага права.

Вялікія намаганні першага ўрада Беларусі былі накіраваны на пошук падтрымкі за мяжой, а не сярод насельніцтва. Даступныя сёння архіўныя дакументы БНР – справа аб консульстве БНР у Канстанцінопалі, мемарандум ад 14 лютага 1921 г. і іншыя – сведчаць аб тым, што дыпламатычныя прадстаўнічыя місіі ці консульствы БНР знаходзіліся ў Латвіі, Літве, Эстоніі, Грузіі, Фінляндзіі, Чэхаславакіі, Балгарыі, Турцыі, Украіне. Не прызналі БНР бліжэйшыя суседзі – Польшча і Савецкая Расія.

Дадатковы руска-германскі дагавор (Берлін, 27 жніўня 1918 г.) прымусіў кайзераўскае войска пакінуць акупаваную тэрыторыю Беларусі на ўсход ад р. Бярэзіны. Адыход германскай арміі пачаўся ў другой палове верасня 1918 г., у лістападзе 1918 г. буржуазная рэвалюцыя ў Германіі звергла кайзераўскую манархію.

Пасля заключэння перамір'я ў Камп'ене, па ленінскаму дэкрэту УЦВК ад 13 лістапада 1918 года ўсе абавязацельствы Расіі па Брэсцкаму дагавору, і ў першую чаргу па тэрытарыяльных уступках і выплаце кантрыбуцыі, былі ануляваны. Заканчэнне вайны, устанаўленне або аднаўленне савецкай улады ў вызваленых раёнах Беларусі, куды заступала Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія, фактычна прывялі да завяршэння гісторыі першай спробы ўтварэння беларускай нацыянальнай рэспублікі. (Юрыдычна толькі ў кастрычніку 1925 г. Берлінская канферэнцыя абвясціла аб самароспуску ўрада БНР). У хуткім часе – усяго праз месяц – у Беларусі пры падтрымцы РСФСР была створана рэспубліка на савецкай аснове.

Падзеі ў час падрыхтоўкі і дзеяння ўмоў Брэст-Літоўскага мірнага дагавору з'яўляюцца доказам таго, што Савецкая Расія ў завяршальны перыяд Першай сусветнай вайны вымушана была заняць стрыманую, насцярожаную пазіцыю да ўсялякіх спроб вырашэння беларускага пытання. Па ўмовах Брэсцкага міру адбыўся першы падзел этнічнай беларускай тэрыторыі. Гэта замарудзіла ход нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на беларускіх землях, садзейнічала расколу яе палітычных сіл. Але нягледзячы на тое, што ні РСФСР, ні Германія не прызналі факт утварэння БНР, упершыню ў гісторыі пытанне аб беларускай дзяржаўнасці было пастаўлена ў плоскасць практычнай рэалізацыі.

**Літаратура**

1. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Вучэб. дап. / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. – 319 с.

2. Довнар-Запольский, М. В. Жребий брошен! // Цвикевич, А. Краткий очерк возникновения Белоруской Народной Республики. – Киев : Типография И.И. Чоколов, 1918 г. – 18 с. – С. 2–3.

3. Зубачевский, В. А. Политика России в отношении восточной части Центральной Европы (1917 – 1923 гг.) : Геополитический аспект / В.А. Зубачевский. – Омск : Изд-во ОМГПУ, 2005. – 240 с.

4. Ладысеў, У. Ф. На пераломе эпох : станаўленне Беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.) У.Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін. – Мінск : БДУ, 1999. – 128 с.